Навука польскага гісторыка

Імя польскага гісторыка Юліуша Бардаха вядомае ў цэлай Еўропе. Ён — сапраўдны член Польскай Акадэміі Навук, італьянскай Accademia Nazionale dei Lincei, доктар *honoris causa* Варшаўскага, Лодзьскага і Віленскага універсітэтаў, член многіх міжнародных навуковых таварыстваў і рэдакцыйных радаў.

Гэта вучоны шматграннага таленту. Ён адначасова скрупулёзны даследчык і актыўны папулярызатар навукі, цярплівы педагог і заўзяты палеміст. Дыяпазон яго навуковых інтарэсаў незвычайна шырокі як храналагічна — ад Сярэднявечча да XX стагоддзя, так і тэматычна — ад «Рускай праўды» і генэзы сойма да пытанняў нацыянальнай свядомасці, падзеяў II сусветнай вайны і метадалогіі ды гісторыі гістарычнай навукі.

У гэтым калейдаскапічным мностве тэмаў сама болей увагі і часу вучоны прысвяціў гісторыі старапольскай дзяржаўнасці і парламентарызму ў Кароне Польскай, але сталай тэмай ягоных штудыяў заўжды былі і праблемы Вялікага Княства Літоўскага – Крэўская і Люблінская уніі, славутыя Статуты, магдэбургія, вялікакняская канцылярыя, узаемадачыненні Вялікага Княства і Кароны ў гады Вялікага сойма, урэшце нацыянальная праблематыка на землях былой Рэчы Паспалітай і шмат чаго іншага. Для нас асабліва важны менавіта гэты даробак Ю. Бардаха ў даследаванні гісторыі абшараў Вялікага Княства – дзяржавы, якая была сваёй і нашым продкам.

Устойлівая ўвага польскага вучонага да мінулага Вялікага Княства не выпадковая. Яго навуковая біяграфія пачыналася ў Віленскім універсітэце імя Стэфана Баторыя. Тут 21-гадовы студэнт Ю. Бардах браў удзел у VI Усеагульным з'ездзе польскіх гісторыкаў (1935), на якім адважыўся выступіць у дыскусіі па рэфератах масцітых вучоных. Пад час штудыяў у Вільні яго захапіла непаўторнасць сімбіёзу гісторыі ды права гэтай часткі Еўропы, іншымі словамі, як сам прызнаваўся ў інтэрвію, зачаравала Вялікае Княства...

Працы Юліуша Бардаха па Вялікім Княстве Літоўскім даўно сталі класікай. Інтэлектуальную жывучасць яго публікацыям забяспечыла неаслабная патрабавальнасць да сябе як даследчыка. Як ужо адзначалася польскімі калегамі вучонага, для кожнага новага выдання публікаваныя раней тэксты ён рэдагаваў па-новаму, дапаўняў найноўшай літаратурай і вынікамі сваіх пазнейшых даследаванняў, некаторыя ж пісаў практычна нанова. Зважаючы на колькасць і якасць публікацыяў Юліуша Бардаха, яго вучань Станіслаў Русоцкі трапна адзначыў, што сядзенне гадзінамі ў бібліятэцы ці за пісьмовым сталом – гэта пэўна «крыніца пастаяннай сатысфакцыі» вучонага.

Заўжды адкрыты на кантакты і добразычлівы, Юліуш Бардах многаму навучыў і вучыць беларускіх гісторыкаў — тых, каму пашчасціла ў асабістым знаёмстве з сапраўдным майстрам. Мяне, у прыватнасці, уражвалі яго рэфлексіі над метадалогіяй і прафесійнай этыкай гісторыка. Перажыўшы не адну змену ўладаў, маючы багаты досвед жыцця ў вялікай навуцы, вучоны ў нялёгкія для яго краіны часы адкрыта пісаў: «Гісторыкі, як і вучоныя іншых спецыяльнасцяў, павінны — калі гэта спатрэбіцца — мець сілу супрацьпаставіць сябе ўладзе». Сёння ў Беларусі, дзе гістарыяграфія зноў ставіцца пад афіцыйны кантроль, гэтыя словы гучаць асабліва надзённа. Мы павінны б цяпер павучыцца нонканфармізму ў нашых польскіх калегаў.

Па-беларуску працы Юліуша Бардаха выходзяць упершыню. У томік яго выбраных штудыяў уключана дзевяць артыкулаў, прысвечаных галоўным чынам дзяржаўна-прававой гісторыі Вялікага Княства ды лёсам яго спадчыны, а таксама поўная бібліяграфія навуковых публікацый вучонага. Цяпер даследаванні варшаўскага літуаніста-класіка будуць даступныя і шырокаму колу беларускіх чытачоў. Упэўнены, што гэтая кніга не толькі запоўніць сур'ёзныя прагалы ў беларускай гістарычнай літаратуры, а наогул будзе вельмі карыснай для нашай гістарыяграфіі, не ўнікшай адчувальнай фрустрацыі адраджэнцкае пары.

Генадзь Сагановіч